ПАДЗЕЯ



# ХРАМ НАШ АГУЛЬНЫ І СВЕТЛЫ

**У Гродне адзначылі 95-годдзе Уладзіміра Караткевіча.**

26 лістапада, у дзень нараджэння класіка айчыннай літаратуры гродзенскія пісьменнікі на чале са старшынёй ГрАА СПБ, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Людмілай Антонаўнай Кебіч па запрашэнні Гродзенскай гімназіі № 5, якая носіць імя Уладзіміра Караткевіча, прынялі ўдзел у юбілейных урачыстасцях.




З удзелам вучняў і дырэктара гімназіі Вольгі Генадзьеўны Хітрушкі адбылося ўрачыстае адкрыццё тэматычнага стэнда «Быў. Ёсць. Буду.». Людміла Антонаўна ў сваёй прамове распавяла аб тым, што значыць для беларусаў постаць і багатая творчая спадчына Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча, яго яркі, шматгранны талент і ўзважаная грамадзянская пазіцыя сапраўднага патрыёта. Кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі вобласці дала інтэрв'ю гарадскому тэлеканалу «Гродна Плюс». Разам з педагогамі і бібліятэкарамі іншых устаноў адукацыі горада над Нёманам Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык, Андрэй Дарожкін і Вольга Алізар наведалі выставу жывапісу пад назвай «Бацькаўшчына светлая мая» па матывах твораў Уладзіміра Караткевіча, затым пакаштавалі стравы беларускай кухні, апісаныя майстрам у нарысе «Зямля пад белымі крыламі». У актавай зале госці гімназіі паслухалі літмантаж, прысвечаны вобразу пісьменніка, ацанілі песні ў выкананні юных спевакоў і з

уласнымі паэтычнымі творамі выступілі перад удзельнікамі агульнагарадскога літаратурнага свята.

У імпрэзе прыняў удзел дырэктар навуковай бібліятэкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, літаратуразнавец Мікалай Грынько. У межах сумеснага праекта ВНУ і гімназіі Мікалай Уладзіміравіч пазнаёміў прысутных з унікальнымі асобнікамі кніг Уладзіміра Караткевіча, падзяліўся цікавымі гісторыямі некаторых публікацый.

Кандыдат у шэрагі Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Вольга Алізар (дзень нараджэння ў якой, дарэчы, супадае з днём народзін У. Караткевіча) прэзентавала сваю новую, трэцюю па ліку кнігу – зборнік лірыкі «Я дачка сінявокай краіны». У гімназіі імя У. Караткевіча вучыцца і дачка паэтэсы Валерыя; дзяўчынка выканала мастацкае аздабленне зборніка. Пісьменнікі падарылі свае кнігі гімназістам і таксама атрымалі памятныя падарункі ад гаспадароў. Наша сяброўства з гарадской гімназіяй, якая адрозніваецца творчым, мастацкім ухілам, доўжыцца не адзін год і можна не сумнявацца – будзе працягвацца. Свята юбілею класіка натхніла сваёй чароўнай атмасферай шчырай дружбы, прыгажосці, чалавечнасці і ў непагодлівы дзень сагрэла дзяцей і дарослых сардэчнай цеплынёй. З удзячнасцю неўміручаму вобразу Уладзіміра Караткевіча ўдзельнікі мерапрыемства далі абяцанне захоўваць вернасць яго запаветам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас літаратурнага свята, прысвечанага 95-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. Гродна, Гімназія № 5 імя У. С. Караткевіча. 26 лістапада 2025 года.



Вольга Хітрушка. Адкрыццё тэматычнага стэнда «Быў. Ёсць. Буду.»



Людміла Кебіч. Уступнае слова


і прэзентацыя свежага выдання



Вольга Алізар



Паэтэса Вольга Алізар і дырэктар гродзенскай Гімназіі № 5 імя У. Караткевіча Вольга Хітрушка



Андрэй Дарожкін








Дзмітрый Радзівончык



Выступае Мікалай Грынько






ГУО «ГИМНАЗИЯ №5

им. В.С.Короткевича г. Гродно